Міхаіл Баярын

# УЗОРЫ СВАДЗЕІ

Прасьветы

# ПРАЗОРА

Празора - гэта свадзея, празь якую пазіраюць на іншую свадзею. Празора пераводзіць чыстую свадзею ў прастору ўспрыманьня.

# ДВАЙНАЯ ПРАЗОРА

Свадзея ў празоры можа быць іншай празорай. Такай празора завецца двайной. *Двайная празора* адначасова зьяўляецца вобразам свадзеі і празорай.

# МЯРЭЖА ЗНАКУ

Двайная празора ўтварае *мярэжу знаку*. Свадзея, што апынаецца пад такой празорай, узьнікае ў празоры як *знак свадзеі*. Мярэжа прысутнічае ў кожным знаку як яго аснова.



# АСНОВА І ЎТОК

Свадзея накладаецца на мярэжу як уток на аснову тканіны. Свадзея выконваецца на мярэжы, запаўняючы адны ячэі мярэжы і пакідаючы пустымі іншыя.



# ПРАСЬВЕТ

Свадзея прасьвечвае праз мярэжу, утвараючы свой знак. Знак, што ўтвараецца празорай, завецца *прасьветам*.



# ДЗЬВЕ ПОЎНІ

Мярэжа ўтварае поўню прасьветаў. Поўні прасьветаў адпавядае поўня свадзеі.



# КОЛА ПРАСЬВЕТАЎ

Мярэжа знаку ўтварае ўсемагчымасьць знакаў. *Кола прасьветаў* - гэта ўсе прасьветы адной мярэжы.



# МОВА ПРАСЬВЕТАЎ

Прасьвет папярэднічае мове. Але ўлучэньне прасьветаў у мярэжу сказу ўтварае мову прасьветаў. Суадпаведнасьць дзьвюх поўняў робіць прасьвет паведамленьнем пра свадзею.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | нараджэньне,<br>ўзьнікненьне,<br>пачатак | | завяршэньне,<br>ахоп,<br>асяганьне | | плынь,<br>рух,<br>ліцьцё | | зрух,<br>напрамак,<br>кіраваньне |
| | сувязь,<br>лучнасьць,<br>яднаньне, | | перасячэньне,<br>пераадоленьне,<br>пераход | | апора,<br>падтрымка,<br>уздым | | колазварот,<br>восевы стан,<br>чын |
| | вынік,<br>плён,<br>дасягненьне | | рост,<br>разьвіцьцё,<br>ўзыход | | паўната,<br>сярэдзіна,<br>нутро | | ахоп,<br>аб’ём,<br>ахова |
| | рух,<br>зварачэньне,<br>гнуткасьць | | трываньне,<br>восевы стан,<br>сталасьць | | пустата,<br>прастора,<br>усё | | памнажэньне,<br>рост,<br>вынікненьне |
| | збор,<br>злучэньне,<br>спражэньне | | выпраменьваньне,<br>выбух,<br>быцьцё | | покрыў,<br>ахова,<br>абарона | | утварэньне,<br>мера,<br>адпаведнасьць |
| | супадзеньне,<br>узаемнасьць,<br>адпаведнасьць | | зараджэньне,<br>крыніца,<br>магута | | галінаваньне,<br>разыходжаньне,<br>разьвіцьцё | | закрыцьцё,<br>змыканьне,<br>хаваньне |
| | падзел,<br>асобнасьць,<br>суладзьдзе | | | | | | |

# МЯРЭЖА СКАЗУ

Становішча ў мярэжы сказу вызначае прасьвет як падзею. Мярэжа сказу мае толькі тры ячэі - асобы, чыну й дачыну. У адзіночнай мярэжы прасьвет становіцца *чынам*.

*Рушыць.*

# ДВАЙНАЯ МЯРЭЖА

У двайной мярэжы першы прасьвет становіцца асобай, а другі - чынам. Ячэі мярэжы сказу падзяляюцца знакам крыжа.



*пераадоленьне ідзе*

# ТРАЙНАЯ МЯРЭЖА

У трайной мярэжы першы прасьвет становіцца асобай, другі - чынам, а трэці  - дачыным.



*пераадоленьне ідзе да зьвяршэньня*

# МЯРЭЖА АДНОСІН

Кожная ячэя мярэжы сказу можа зьмяшчаць мярэжу адносін. У мярэжы адносін першая ячэя вызначае галоўны прасьвет, другая - залежны.

# МЯРЭЖА СУВОЮ

Адносіны сувою - гэта адносіны тоества, якія вызначаюцца словамі “той, які”. Адносіны сувою выражаюцца знакам крыжа з дужкай зьверху.



*перамога, якая вяртаецца*

# МЯРЭЖА РАЗВОЮ

Адносіны сувою - гэта адносіны валоданьня, якія вызначаюцца словамі “той, у якога”. Адносіны развою выражаюцца знакам крыжа з дужкай зьнізу.

*перамога вяртаньня*

# РАЗВОЙ СУВОЮ

Адносіны развою сувою ўтвараюцца, калі другая ячэя мярэжы развою раскрываецца мярэжай сувою.



*перамога бліскучага вяртаньня*

# СУВОЙ РАЗВОЮ

Адносіны сувою развою ўтвараюцца, калі другая ячэя сувою раскрываецца мярэжай развою.

*бліскучая перамога бліскучага вяртаньня*

# РАЗЬВІТЫ СКАЗ

Сказ, мярэжа якога запоўнена мярэжай адносін, завецца разьвітым.

*бліскучае пераадоленьне ідзе да поўнага зьвяршэньня*

# ЗГОРТ КАРАНЁЎ

Просты сказ можа быць згорнуты ў корань. У коранi прасьветы не падзяляюцца крыжамi. Адзiн прасьвет роўны адзiночнаму кораню. Два прасьветы згортваюцца ў двайны корань.

*“перамога-праменiць”*

# ТРАЙНЫ КОРАНЬ

Тры прасьветы згортваюцца ў трайны корань. Унутры кораня няма мярэжаў adносін.

*“перамога-праменіць-вяртаньне”*

# СЛОВА

Улучэньне каранёў у мярэжы адносін утварае *слова*.

*‘бліскучае-пераадоленьне’ ‘імкліва-ідзе’ да ‘поўнага-зьвяршэньня’*

# МЯРЭЖА РАСКАЗУ

Мярэжа сказу можа запаўняцца сказамі і ўтвараць расказ. Сказы ў мярэжы расказу падзяляюцца знакам крыжа зь дзьвюмя дужкамі.

*тое, што пераадоленьне ідзе, прычыняе тое, што зьвяршэньне спаўняецца*

# РАДНО

Некалькі сказаў пасьлядоўна ўтвараюць радно. Сказы радна падзяляюцца знакам разрыву.

*Пераадоленьне ідзе. Зьвяршэньне спаўняецца.*

*Ня вернецца воін,*
*вандроўнік ня вернецца,*
*вернецца сейбіт…*
*Заўсёды вяртаецца сейбіт.*

*Алесь Разанаў*



*А дзе ж тая крынічэнька, што голуб купаўся?*
*А дзе тая дзяўчынонька, што я заляцаўся?*

*Ой жаль, жаль мне будзе, возьмуць яе людзі,*
*возьмуць яе людзі, а мне не будзе.*

*А ўжо з тае крынічэнькі валы ваду п'юць.*
*А ўжо тую дзяўчыноньку за руку вядуць.*

*Ой жаль, жаль мне будзе, возьмуць яе людзі,*
*возьмуць яе людзі, а мне не будзе.*

*А я тую крынічэньку тыччам перацычу,*
*А я тую дзяўчыноньку клічам пераклічу.*

*Ой жаль, жаль мне будзе, возьмуць яе людзі,*
*возьмуць яе людзі, а мне не будзе.*



# НАПРАМАК

Радно можа мецць многа вымераў. Калі радно мае больш за адзін вымер, сказ мае скончацца знакам напрамку. Сказ, што мае два напрамкі, мае чытаньне ў абодва бакі.

*Пераадоленьне ідзе. Рух пераадольвае.*

# ПРАСТОРА

Мнагамернае радно ўтварае *прастору прасьветаў*, што можа чытацца з усіх бакоў ува ўсе бакі. У прасторы прасьветаў прасьвет любога сказу можа стаць прасьветам іншага сказу.



